Раней памер кампенсацыі залежаў ад базавай велічыні: за кожную данацыю крыві і яе кампанентаў донары атрымлівалі 1,5 базавай велічыні, або Br52,5 тыс. (адна базавая велічыня складае Br35 тыс.). Цяпер донары будуць атрымліваць за данацыю крыві і яе кампанентаў 35 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, які дзейнічаў на дзень выплаты кампенсацыі. Цяпер гэта больш за Br200 тыс. (на 1 лістапада памер БПМ — Br574 790).

Дакумент таксама прадугледжвае, што за кожную дозу крыві донары плазмы будуць атрымліваць 9 працэнтаў БПМ, донары клетак крыві, атрыманых цытаферэзам, — 15 працэнтаў БПМ, ізаімунныя донары крыві і плазмы — 35 працэнтаў БПМ. Донарам эрытрацытаў, што выкарыстоўваюцца для тэсціравання сываратак, пры ўмове выканання донарскай функцыі ў поўным аб'ёме (доза крыві ад 300 да 450 мл +/- 50 мл) выплацяць 100 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. Пры гэтым выплаты будуць ажыццяўляцца прапарцыянальна фактычна здадзенаму аб'ёму крыві. Кошт адной працэдуры імунізацыі анатаксінамі, імунамадулятарамі, вакцынамі складзе 5 працэнтаў БПМ. А за кожную працэдуру імунізацыі эрытрацытамі, імунамадулятарамі донарам будуць выплачваць 10 працэнтаў БПМ. Адзін працэнт БПМ за кожную гадзіну, праведзеную ў арганізацыі пералівання крыві, атрымаюць донары, адхіленыя ад здачы крыві па медыцынскіх паказаннях, а таксама за час правядзення імунізацыі. Донарам, якія выканалі донарскую функцыю не ў поўным аб'ёме, належыць 3 працэнты БПМ.

Усе вышэйпералічаныя грашовыя кампенсацыі пры выплаце падсумоўваюцца, калі чалавек у поўным аб'ёме выканаў донарскую функцыю.

Пастанова прадугледжвае таксама змяненне памеру сумы на бясплатнае харчаванне донараў. Да працэдуры здачы крыві — з 0,1 базавай велічыні да 2 працэнтаў БПМ, пасля здачы крыві чалавек атрымлівае талон на харчаванне, па якім у пэўных аб'ектах грамадскага харчавання зможа паабедаць на суму, роўную 10 працэнтаў БПМ (раней — 0,4 БВ). Донар можа адмовіцца ад талона і атрымаць належную яму кампенсацыю грашыма. Навучэнцам і студэнтам дзённай формы адукацыі для атрымання сваіх 10 працэнтаў БПМ неабходна прадставіць у арганізацыю пералівання крыві адпаведную даведку.

**Пастанова ўступіць у сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НАДЗЕЯ ЕРМАКОВА ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ ЗМЯНІЦЬ ВАЛЮТУ ВЫЛІЧЭННЯ НАРМАТЫЎНАГА КАПІТАЛУ БАНКАЎ НА БЕЛАРУСКІЯ РУБЛІ

**Кіраўнік Нацыянальнага банка Надзея Ермакова лічыць неабходным змяніць валюту вылічэння нарматыўнага капіталу банкаў на беларускія рублі. Аб гэтым яна паведаміла БЕЛТА.**

«Лічу, што, напэўна, гэта трэба рабіць. Тое, што заявіў Дубкоў (намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. — Заўвага. БЕЛТА), можа, ён сваё меркаванне выказаў. У прынцыпе я лічу, і мы ўжо разглядаем гэта пытанне па прапанове асацыяцыі банкаў і камерцыйных банкаў. Адзінае нам трэба яшчэ яго ўзгадніць з міжнародным аўдытам, як гэта будзе тады ацэньвацца, каб горш не зрабіць для банкаў», — сказала Надзея Ермакова.

Гаворачы аб тым, што дасць гэты захад, яна адзначыла: «Цяпер банкі страцілі капітал за кошт абясцэньвання. Як яго цяпер падлічыць, якім ён павінен быць? Таму, чаму мы не можам самі ў сябе супаставіць? Мы выдаём крэдыты, лічым у сябе ўсё ў нацыянальнай валюце, таму і капітал можна вылічваць у нацыянальнай валюце».

«Я мяркую, што гэта рабіць трэба, але ўсё роўна трэба падысці да гэтага вельмі ўзважана», — сказала кіраўнік Нацбанка.

«Лічу, што да канца года мы з гэтым пытаннем павінны адназначна разабрацца і прыняць рашэнне», — адзначыла Надзея Ермакова.

Пры гэтым яна заўважыла, што ў выпадку захавання вылічэння нарматыўнага капіталу банкаў у валюце, узнікае пытанне, у якой менавіта. «Таксама пытанне: у еўра або ў доларах. Што будзе з еўра, мы не ведаем, а мы лічым, што абавязкова трэба прывязвацца ў ацэнцы капіталу да еўра. А, можа, долара», — дадала кіраўнік Нацбанка.

Нагадаем, 11 лістапада на 6-й міжнароднай канферэнцыі па развіцці банкаўскага рознічнага бізнэсу ў Мінску намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей Дубкоў заявіў аб немэтазгоднасці змянення валюты вылічэння нарматываў мінімальнага памеру статутнага фонду і мінімальнага памеру нарматыўнага капіталу банкаў з еўра на беларускія рублі.

# Вызначаны дадатковыя патрабаванні да камерцыйных забудоўшчыкаў

**НА мінулым тыдні Саўмін Беларусі зацвердзіў дакумент па парадку прадастаўлення звестак забудоўшчыкамі, якія ажыццяўляюць долевае будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў.**

Дакумент вызначае абавязковае выкананне забудоўшчыкамі пэўных нарматываў ацэнкі фінансавай трываласці іх дзейнасці. Так, нарматыў забяспечанасці абавязацельстваў, які вызначаецца шляхам дзялення сумы актываў забудоўшчыка на суму яго абавязацельстваў па дагаворах стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва павінен быць не меншым за 0,5. Другі нарматыў бясстратнасці, што вызначаецца праз колькасць гадоў з апошніх трох, па выніках якіх у забудоўшчыка адсутнічалі страты, павінен быць не меншым за 2.

Гэтыя нарматывы забудоўшчык будзе штоквартальна накіроўваць у мясцовыя выканаўчыя органы. Мясцовыя ўлады, у сваю чаргу, павінны будуць у пастаянным рэжыме аналізаваць гэтую інфармацыю, каб своечасова прымаць адпаведныя меры па абароне інтарэсаў дольшчыкаў. Вызначана, што гэты дакумент пачне дзейнічаць праз тры месяцы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Кватэрнае пытанне

# ВАШ ДОМ — ВАША КРЭПАСЦЬ

**Нашай Канстытуцыяй гарантуецца недатыкальнасць жылля і іншых законных уладанняў. А ў чым сутнасць гэтага права і як яно рэалізуецца на практыцы?**

**Міхаіл Л.**, *г. Орша.*

Гарантыя недатыкальнасці жытла (артыкул 29 Канстытуцыі) забяспечвае асабістае права грамадзян, якія пражываюць на законнай падставе ў жылым памяшканні, якое звязана з іх маёмасным правам, і азначае, што ніхто не мае права без законнай падставы ўвайсці ў жытло і іншае законнае ўладанне грамадзяніна супраць яго волі.

Парушэннем права на недатыкальнасць жытла будзе з'яўляцца любы выпадак незаконнага ўваходжання, тайнага або адкрытага пранікнення, уварвання ў жылое памяшканне без дазволу асоб, якія пражываюць у ім.

Права на недатыкальнасць жытла забяспечваецца адпаведнымі нормамі крымінальнага, адміністрацыйнага і працэсуальнага заканадаўства, якія прадугледжваюць, у прыватнасці, канкрэтныя падставы, калі іншыя асобы маюць права ўвайсці ў жытло як па згодзе, так і без згоды асоб, якія пражываюць у ім, а таксама адказнасць за супрацьпраўныя дзеянні, якія парушаюць недатыкальнасць жытла.

Напрыклад, правядзенне асобных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў рэгламентуецца Законам Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 289-З «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці».

Такія асобныя мерапрыемствы (гаворка ідзе пра абследаванне жылых памяшканняў з мэтай магчымага выяўлення прыкмет злачыннай дзейнасці, а таксама падзей або дзеянняў, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы дзяржавы) пры неабходнасці могуць праводзіцца толькі з санкцыі пракурора або яго намесніка на падставе матываванай пастановы адпаведнага органа, які ажыццяўляе аператыўна-вышуковую дзейнасць і пры наяўнасці інфармацыі аб прыкметах (асобах) злачынства, якое рыхтуецца, учыняецца або ўжо ўчынена, а таксама падзеях і дзеяннях, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, якія не церпяць адкладання і могуць прывесці да ўчынення цяжкага або асабліва цяжкага злачынства, а таксама пры наяўнасці звестак пра падзеі і дзеянні, якія ствараюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, дапускаецца, у прыватнасці, абследаванне жылых памяшканняў, што займаюць грамадзяне, на падставе матываванай пастановы органа, які ажыццяўляе аператыўна-вышуковую дзейнасць, з абавязковым пісьмовым паведамленнем адпаведнаму пракурору або яго намесніку на працягу 24 гадзін. На працягу 48 гадзін з моманту пачатку правядзення аператыўна-вышуковага мерапрыемства орган, які яго ажыццяўляе, абавязаны атрымаць санкцыю пракурора або яго намесніка на правядзенне такога мерапрыемства або спыніць яго правядзенне.

Адпаведныя нормы прадугледжаны і артыкулам 2.6 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, 74 Падатковага...

Грамадзяне, якія мяркуюць, што дзеянні органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, прывялі да парушэння або абмежавання іх правоў і свабод, могуць абскардзіць гэтыя дзеянні ў вышэйшы орган, які ажыццяўляе аператыўна-вышуковую дзейнасць, пракурору або ў суд.

У адпаведнасці з арт. 9 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь грамадзяне павінны забяспечваць доступ у жылыя і дапаможныя памяшканні работнікам, занятым абслугоўваннем і эксплуатацыяй жыллёвага фонду, для праверкі тэхнічнага і санітарнага стану памяшканняў і абсталявання, а таксама правядзення рамонтных і аварыйных работ.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2008 г. № 405-З «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» выканаўца абавязаны інфармаваць спажыўца аб правядзенні сістэматычных аглядаў жылога памяшкання спажыўца, аб неабходнасці выканання прафілактычных і рамонтных работ, калі іх невыкананне можа прывесці да аварый, няшчасных выпадкаў або нанесці шкоду жыццю, здароўю і (або) маёмасці спажыўца, або негатыўна адбіцца на якасці аказання жыллёва-камунальных паслуг.

Пры гэтым, у выпадках, калі аказанне жыллёва-камунальных паслуг патрабуе атрымання доступу ў жылое памяшканне спажыўца, выканаўца абавязаны (за выключэннем выпадкаў ліквідацыі наступстваў аварый, стыхійных бедстваў і іншых надзвычайных сітуацый) загадзя, але не пазней чым за адзін дзень праінфармаваць спажыўца аб даце і часе аказання жыллёва-камунальных паслуг, імені і пасадзе (прафесіі) работнікаў выканаўцаў, якім даручана аказанне жыллёва-камунальнай паслугі, і асобах, якія ажыццяўляюць кантроль ад імя выканаўцы за ходам аказання такіх паслуг, прадаставіць па просьбе спажыўца іншыя звесткі, якія маюць дачыненне да жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца.

**Віктар САВІЦКІ.**

Спорт-тайм

## Барысаўскі БАТЭ выбыў з розыгрышу Кубка Беларусі

Нечаканы вынік прынёс матч 1/8 фіналу Кубка Беларусі паміж барысаўскім БАТЭ і брэсцкім «Дынама». Чэмпіён Беларусі прайграў брастаўчанам 1:3 і выбыў з далейшага розыгрышу. У другім матчы «Мінск» адолеў «Белшыну» — 3:0. Астатнія паядынкі праходзілі 21 верасня, і ў 1/4 фіналу выйшлі СКВІЧ (Мінск, Д2), «Нафтан» (Наваполацк), «Ліда» (Д3), «Клечаск» (Клецк, Д2), «Нёман» (Гродна), «Гомель». Матчы гэтай стадыі пройдуць вясной 2012 года.

## Моладзевая зборная перамагла каманду Сан-Марына

У кваліфікацыйным матчы моладзевая зборная пад кіраўніцтвам Юрыя Шуканава выйграла ў каманды Сан-Марына — 2:0. У першым тайме лік адкрыў Дзмітрый Хлебасолаў, які рэалізаваў пенальці, а ў другім лічбы на табло падвоіў Аляксандр Куган. Становішча ў 1-й групе наступнае: Германія 18 ачкоў (6 матчаў, розніца мячоў — 28-5), Беларусь — 10 (6, 10-8), Грэцыя — 9 (5, 13-9), Боснія і Герцагавіна — 7 (4, 9-5), Кіпр — 3 (5, 9-14), Сан-Марына — 0 (6, 0-28).

Футбалісты алімпійскай зборнай Беларусі пад кіраўніцтвам Георгія Кандрацьева правялі першы з двух таварыскіх матчаў на Аравійскім паўвостраве: унічыю згулялі з алімпійскай дружынай Саудаўскай Аравіі (0:0). Сёння яны згуляюць супраць равеснікаў з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. А вось запланаваны на 11 лістапада матч галоўнай каманды краіны са зборнай Нігера не адбыўся. Федэрацыя ААЭ не паспела ўзгадніць з ФІФА ўмовы правядзення сустрэчы на сваёй тэрыторыі. Сёння падапечныя Бернда Штанге павінны сустрэцца з камандай Лівіі.

## Зборная Беларусі заняла апошняе месца на Кубку Палесся

Хакеісты зборнай Беларусі ў апошнім матчы на Кубку Палесся разгромна саступілі камандзе Даніі (2:8) і занялі апошняе месца на гэтым міжнародным турніры. У папярэднім матчы наша каманда, сабраная ў асноўным з гульцоў чэмпіянату Беларусі, саступіла зборнай Расіі (1:4), а стартавала з пройгрышу славенцам — 0:6. Гэта быў першы турнір пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера фіна Кары Хейкіля. Пераможцам турніру стала другая зборная Расіі, якая выйграла ўсе матчы.

## Расіяне выйгралі Кубак Прэзідэнцкага клуба

Зборная Расіі другі год запар перамагае на міжнародным турніры юных хакеістаў «Кубак прэзідэнцкага спартыўнага клуба». У вырашальным матчы падапечным Паўла Бауліна ўдалося абыграць беларускую юніёрскую зборную — 4:2. Трэцяе месца заняла каманда Славеніі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Ад прадзедаў...

# ВЯРТАННЕ ЗАБЫТЫХ СЛОЎ

*Спарон, дырха, кабылянец, змурачка...*

**ШТО азначаюць гэтыя словы? Можна даведацца з руска-беларускага тлумачальнага слоўніка медыцынскіх тэрмінаў — першага выдання такога тыпу ў беларускім мовазнаўстве. Кніга змяшчае больш за тры тысячы тэрмінаў і тлумачэнняў да іх, прычым каля дзвюх тысяч, уласнабеларускіх. З аўтарам слоўніка, старшым выкладчыкам кафедры рускай і беларускай моў Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Віктарам ВАРАНЦОМ гутарыць карэспандэнт «Звязды».**

У 2005 годзе быў выдадзены руска-беларускі медыцынскі слоўнік. А цяпер — яшчэ і руска-беларускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў. Такім чынам, дзякуючы Віктару Варанцу менавіта ў медыцыне, у адрозненне ад многіх іншых галін грамадскага жыцця, беларускай лексікаграфіяй зроблены сапраўдны прарыў. І гэта, заўважце, у такой даволі спецыфічнай з моўнага пункту гледжання сферы, дзе большая частка тэрмінаў — грэчаскага і лацінскага паходжання.

**— Дык ці варта аўчынка выраба пры складанні падобных слоўнікаў?** — цікаўлюся ў Віктара Іванавіча.

— Справа ў тым, што ў нас увогуле не была распрацавана медыцынская тэрміналогія. У 1920-я гады тэрміналагічная камісія выпрацавала некалькі такіх выданняў, але з таго часу практычна нічога і не было. А паколькі медыцына — адна з найбольш запатрабаваных сфер у грамадскасці (як бы там ні было, у нас, згодна з вынікамі па перапісе, прыкладна 30 % людзей лічаць сябе беларускамоўнымі), то, адпаведна, трэба мець забеспячэнне медыцынскай тэрміналогіяй. Больш за тое, у нас ёсць і дактары, якія вядуць прыёмы на беларускай мове. Усё гэта разам падштурхнула да таго, што трэба было зрабіць руска-беларускі медыцынскі слоўнік. Ён, дарэчы, быў вельмі запатрабаваны — некалькі разоў перавыдаваўся, 20 асобнікаў дадаткова папрасіла Нацыянальная бібліятэка.

Аднак толькі гэтага слоўніка аказалася нядосыць. Бо людзі хочуць ведаць, што абазначае той ці іншы медыцынскі тэрмін. Нават у рускай мове часам ставяць дыягназ — чалавек чытае і не разумее, што гэта такое. А ўлічваючы, што ў нас у асноўным лексіка запазычаная, то нарадзілася ідэя даць тлумачэнне да кожнай хваробы, кожнага медыцынскага паняцця. Прычым каб задаволіць усіх, у тым ліку і кансерватыўную частку медыцыны, якая заўсёды спасылаецца на тое, што аснова — гэта лацінская і грэчаская мовы і нічога іншага асабліва тут не трэба. У слоўніку спачатку даецца калька з лацінскай ці грэчаскай мовы. А далей ідзе ўласнабеларускі тэрмін, калі ён, зразумела, ёсць. З трох тысяч тэрмінаў у слоўніку прыкладна дзве тысячы — уласнабеларускія. Многія з іх ужо нават даўно забылі, хаця яны існавалі ў беларускай мове і паступова проста былі выцiснены.

**— Да прыкладу, якія словы дзякуючы гэтаму слоўніку быццам вяртаюцца з забыцця?**

— Скажам, вельмі цікавая сітуацыя адбылася са словам «аборт». Ва ўсіх слоўніках гэтае слова так і ідзе. Але ў мінулыя стагоддзі на Беларусі існавала такое паняцце як спарон. І вось я ўжо ўвёў гэты тэрмін сабе ў слоўнік, як потым мне філолагі кажуць, што ён даўно выйшаў з ужывання і практычна стаў архаізмам. Аднак зайшоў я неяк па справах у Гродзенскі перынатальны цэнтр і пачуў, што дактары там, нават размаўляючы па-руску, ужываюць слова «спарон». Значыць, яно не выйшла з ужывання — яго проста забылі, але ў практычнай медыцыне сустракаецца.

І такіх прыкладаў шмат. Некаторыя словы камусьці, можа, пададуцца зусім незнаёмымі. Таму, каб было лепш зразумела, пра што ідзе гаворка, у канцы слоўніка даецца яшчэ кароткі беларуска-рускі слоўнік гэтых «новых» слоў. Напрыклад: «**дырха** — трахея», «**кабылянец** — аппендицит», «**дыхніца** — гортань», «**адзінец** — большой палец», «**галачка** — таблетка», «**ірдзень** — румянец», «**ліпля** — инфекция», «**дуцік** — ампула», «**зубасад** — дантист», «**змурачка** — морщина» ...

Па першых водгуках, як толькі гэты слоўнік з'явіўся, мы ўбачылі, што людзі вельмі цікавяцца рознымі медыцынскімі паняццямі. Дарэчы, сёння ў нас практычна немагчыма знайсці нават рускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў. І я заўважыў, што і рускамоўныя людзі бяруць гэты руска-беларускі слоўнік, шукаюць там патрэбнае.

**— Якія крыніцы выкарыстоўваліся ў працы над слоўнікам?**

— Гэта 24 выданні медыцынскага і агульнага характару, у тым ліку і ўжо, скажам, забытыя слоўнікі. Наватвораў у гэтым слоўніку зусім няма, ніводнага слова я сам не прыдумаў. Усе гэтыя словы былі, яны жылі, але проста іх з цягам часу забылі.

**— Каму гэты слоўнік можа быць карысным?**

— Па-першае, паколькі ў медыцынскіх універсітэтах чытаецца курс «Беларуская мова. Прафесійная лексіка», ён разлічаны на студэнтаў і выкладчыкаў. Па-другое, для спецыялістаў практычнай медыцыны. Скажам, прыходзіць да доктара беларускамоўны пацыент... Безумоўна, калі моцна баліць, то, мусіць, на любой мове зразумееш. Але, як кожны інтэлігентны чалавек, доктар павінен валодаць і беларускай мовай. І па-трэцяе, у нас зараз уведзены абавязковы экзамен для аспірантаў і суіскальнікаў па беларускай мове.

Спадзяюся, слоўнік будзе карысным не толькі студэнтам і выкладчыкам медыцынскіх навучальных устаноў, практыкуючым медыкам, але і ўсім неабыякавым да роднага слова, тым, хто цікавіцца нейкімі новымі працэсамі, што адбываюцца ў беларускай лексікаграфіі.

**— А ці павінны быць нейкія моўныя стандарты, напрыклад, у назваў лекаў? У айчынных прэпаратаў, калі меркаваць па маёй дамашняй аптэчцы, беларуская мова зусім не ў пашане, чаго не скажаш, напрыклад, пра ўкраінскіх вытворцаў ...**

— Лічу, што пакуль не будзе зацікаўленасці з боку міністэрства, пэўна, нічога і не адбудзецца. Але, думаю, тут пытанне яшчэ вось у чым. У кожнай медыцынскай ВНУ выкладаецца курс прафесійнай лексікі, але практычна зацверджанай лексікі няма. Вось выйшаў руска-беларускі медыцынскі слоўнік, але ім можна карыстацца, а можна і не карыстацца. Яго ніхто афіцыйна не забараніў, але... Быў такі выпадак. Адзін чалавек абараняў кандыдацкую дысертацыю, і рэзюмэ да яе трэба было пісаць па-беларуску, выкарыстоўваючы толькі ўласнабеларускія тэрміны. Падчас абароны сказалі: «Мы не разумеем гэтых слоў, напішыце на нармальнай мове». І зноў прыйшлося карыстацца выключна калькамі з лацінскай і рускай мовы. Вось гэта прынялі. Таму я ўжо неаднаразова казаў, што гэтай справай павінны зацікавіцца і міністэрства, і рэспубліканская тэрміналагічная камісія. Ёсць слоўнікі, але пакуль усё гэта не набудзе афіцыйныя рамкі, нічога не атрымаецца. Мы сёння нават не можам сказаць фармацэўтам: «Пішыце назвы па-беларуску». Бо яны запытаюцца, на якой беларускай мове трэба пісаць — на калькаванай ці на ўласнабеларускай. А паколькі няма ўнармаванай мовы, то можна пісаць, як хочаш.

**— Ці не выдаяце вы жаданае за сапраўднае, гаворачы пра работнікаў аховы здароўя, якія вядуць прыём пацыентаў на беларускай мове?**

— Безумоўна, іх, як гэта ні сумна, адзінкі. Напрыклад, у Гродне я ведаю толькі дваіх. Хаця... У нашым універсітэце каля трыццаці, а то і сарака выкладчыкаў свабодна валодаюць беларускай мовай. Прафесар Алесь Астроўскі па-беларуску чытае лекцыі на кафедры біялогіі. Дэкан факультэта замежных студэнтаў Андрэй Плоцкі, па адукацыі акушэр-гінеколаг, на многіх канферэнцыях таксама выступае з дакладамі па-беларуску. Дасканала валодае беларускай мовай і прызнаны аўтарытэт у галіне дзіцячых інфекцыйных хвароб, прафесар Уладзімір Васільеў ...

**— А студэнты?**

— Напрыклад, пазалетась да мяне прыйшлі 12 пяцікурснікаў (беларуская мова толькі на першым курсе вывучаецца) і папрасілі арганізаваць гурток па вывучэнні беларускай мовы менавіта на ўзроўні будучай прафесіі. Мы год з імі займаліся. Зараз зноў прыйшлі пяцікурснікі з такой жа прапановай. Прыкладна 10 адсоткаў студэнтаў — гэта людзі, якія шчыра зацікаўлены ў папулярызацыі беларускай мовы, якія яе вывучаюць і размаўляюць па-беларуску ў штодзённым жыцці.

Дарэчы, у нашым універсітэце зараз усе афіцыйныя паперы па справаводстве прадубліравалі на беларускую мову. Гэта значыць, калі прыходзіш пісаць заяву альбо бярэш камандзіроўку, то можна карыстацца рускамоўным варыянтам, а можна — беларускамоўным. Ужо нядрэнна.

Але, зноў жа, няма афіцыйнага распараджэння зрабіць ва ўніверсітэце беларускамоўную плынь, бо ёсць моладзь, якая прыходзіць з беларускіх школ. Хаця калісьці мы пісалі падручнікі — у нас ёсць, напрыклад, цудоўны падручнік на беларускай мове па судовай медыцыне, але ён таксама не запатрабаваны, бо ўсё ідзе на рускай мове.

**— Ці не застанецца руска-беларускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў толькі ў сценах Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта, дзе ён аддрукаваны? Якія перспектывы?**

— Мы выпусцілі пілотны тыраж у 50 асобнікаў, гэта кропля ў моры. Праўда, была размова з выдавецтвам «Вышэйшая школа». Там не супраць выдаць такую кніжку, але ім трэба гарантыя, што яна знойдзе свайго пакупніка. І было б вельмі цудоўна, каб слоўнік зацікавіў і іншыя медыцынскія ўніверсітэты, установы аховы здароўя. А будзе зацікаўленасць — можна выпусціць і больш. Слоўнік з'явіцца тады і ў продажы, прычым не абавязкова толькі для медыкаў. Хтосьці купіць для калекцыі, хтосьці, каб нешта паглядзець, лепш зразумець, што за хвароба, ад чаго лечаць. Будзе папулярызацыя і медыцынскіх ведаў, і беларускай мовы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# САНТЭХНІКА ВЫКЛІКАЛІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, майце на ўвазе, што зараз кожнаму ЖЭСу альбо ЖЭУ даведзены план па аказанні насельніцтву платных паслуг. І, зразумела, яны імкнуцца яго выканаць. На практыцы гэта азначае, што калі вы не задаволены працай сантэхнікаў вашага ЖЭСа, вы можаце выклікаць спецыяліста з іншай (напрыклад, суседняй) жыллёва-эксплуатацыйнай службы. Як правіла, сёння ЖЭСы нікому не адмаўляюць у платных паслугах і асабліва не зважаюць на тое, на іх тэрыторыі альбо не на іх жыве кліент.

**Хацелася б звярнуць увагу вось на што: хоць мы і напісалі, што цэны на паслугі могуць розніцца, усё ж некаторыя разбежкі ў іх аказаліся вельмі нечаканымі. Цяжка зразумець, чаму, напрыклад, замена водаразборнай калонкі ў адным ЖЭСе каштуе 127 752 рублі, у другім — 142 400 рублёў, а ў трэцім — аж 300 547 рублёў! А за агляд той жа калонкі ў Брэсце трэба аддаць 2 410 рублёў, а ў Клімавічах — ужо 78 632 рублі! Што за залаты спецыяліст з небывалым разрадам будзе аглядаць гэтую калонку і якая ў яго, дарэчы, зарплата?**

| Назва работы (паслугі) | Адзінка вымярэння | ЖРЭА №1 Фрунзенскага р-на г. Мінска | КУП ЖРЭУ г. Брэста | ЖРЭУ г. Пінска | ЖКГ «Бабруйскжылкамгас» | Гарводаканал, г. Магілёў | УКП «Камунальнік», Клімавічы | Ф-л «Райводаканал» ГУПП «Івацэвіцкае ЖКГ» |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зняцце ванны | прыбор | 37 160 | 38 221 | 41 510 | 65 330 | 35 425 | 37 868 | 34 290 |
| Устаноўка ванны | прыбор | 45 540 | 46 847 | 50 880 | 80 070 | 43 477 | 56 803 | 42 028 |
| Устаноўка фаянсавага ўнітаза | прыбор | 24 500 | 25 199 | 27 800 | 43 070 | 23 381 | 10 241 | 22 607 |
| Зняцце ўнітаза тыпу «Кампакт» | прыбор | 16 930 | 17 419 | 19 220 | 29 780 | 46 642 | 46 117 | 15 628 |
| Зняцце змяшальніка насценнага для ўмывальнікаў, мыек або ракавін | шт. | 5 430 | 5 581 | 6 060 | 9 540 | 5 458 | 8 080 | 5 007 |
| Зняцце змяшальніка настольнага для ўмывальнікаў, мыек або ракавін | шт. | 6 410 | 6 596 | 7 160 | 11 270 | 6 150 | 13 220 | 5 917 |
| Устаноўка змяшальніка насценнага для ўмывальнікаў, мыек або ракавін | шт. | 12 660 | 13 022 | 14 140 | 22 260 | 12 661 | 10 709 | 11 683 |
| Устаноўка змяшальніка настольнага для ўмывальнікаў, мыек або ракавін | шт. | 23 180 | 23 846 | 25 900 | 40 760 | 22 120 | 17 525 | 21 393 |
| Зняцце змяшальніка для ванны | шт. | 10 360 | 10 655 | 11 570 | 18 210 | 10 369 | 15 240 | 9 559 |
| Зняцце сіфона | прыбор | 3 620 | 3 721 | 4 040 | 6 360 | Няма звестак | 13 836 | 3 338 |
| Устаноўка мыйкі на 1 аддзяленне | прыбор | 22 690 | 23 339 | 25 350 | 39 890 | 21 659 | 35 869 | 20 938 |
| Устаноўка мыйкі на 2 аддзяленні | прыбор | 28 280 | 29 089 | 31 590 | 49 720 | 26 971 | 42 701 | 26 097 |
| Зняцце змяшальніка з душавой сеткай | шт. | 8 550 | 8 794 | 9 550 | 15 030 | 8 332 | 25 625 | 7 890 |
| Зняцце вентыльнай галоўкі | шт. | 1 410 | 1 418 | 1 610 | 2 890 | 1613 | 5 979 | 1 517 |
| Пракладка труб з поліпрапілена дыяметрам да 15-50 мм | м | Ад 12 000 да 29 590 у залежнасці ад дыяметру | Ад 12 346 да 20 125 у залежнасці ад дыяметру | Ад 13 410 да 21 860 у залежнасці ад дыяметру | Ад 21 100 да 34 400 | Ад 13 486 да 21 259 | Ад 18 029 да 19 556 | Ад 11 076 да 18 055 у залежнасці ад дыяметру |
| Пракладка вонкавага трубапровода з поліэтыленавых труб дыяметрам да 20-40 мм | м | Ад 18 580 да 29 590 у залежнасці ад дыяметру | Ад 14 883 да 30 442 у залежнасці ад дыяметру | Ад 16 160 да 33 060 у залежнасці ад дыяметру | Ад 32 670 да 52 030 | Ад 26 208 да 41 750 | 7 412 | Ад 13 352 да 27 310 у залежнасці ад дыяметру |
| Паверка індывідуальнага лічыльніка вады, які патрабуе рамонту | лічыльнік | Ад 8 880 да 22 850 у залежнасці ад рамонту | — | — | — | Ад 14 660 да 37 660 у залежнасці ад рамонту | — | — |
| Замена водаразборнай калонкі | шт. | | 142 400 | — | — | 128 116 | 300 547 | 127 752 |
| Агляд водаразборнай калонкі | шт. | | 2 410 | — | — | 4 382 | 78 632 | 2 579 |

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Вяртаючыся да надрукаванага

# Ці хопіць грошай у бюджэце 2012 года на мемарыял у Трасцянцы?

**У лістападзе 1941 года, якраз 70 гадоў таму, за дзесяць кіламетраў ад Мінска фашыстамі быў арганізаваны лагер смерці «Трасцянец», у якім за гады вайны было знішчана каля 200 тысяч (а то і больш, па іншых падліках) чалавек — цывільнае насельніцтва, савецкія ваеннапалонныя, яўрэі з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Беларусі... Такім чынам, гэты канцэнтрацыйны лагер пад Мінскам быў самым буйным на тэрыторыі СССР па колькасці ахвяр і чацвёртым у Еўропе пасля сумна знакамітых Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі. Але, на жаль, памяць загінулых у «Трасцянцы» людзей як след не ўшанавана (некалькі сціплых памятных знакаў лічыць не будзем): стварэнне вялікага мемарыяльнага комплексу расцягнулася на дзясяткі гадоў, пра што «Звязда» неаднаразова пісала. Сёння мы зноў вяртаемся да тэмы ўшанавання памяці ахвяр «Трасцянца» і спрабуем высветліць, як рухаецца справа.**



Так будзе выглядаць скульптурная кампазіцыя Канстанціна Касцючэнкі «Вароты памяці».

У 2009 годзе здавалася, што стварэнне мемарыяльнага комплексу ў «Трасцянцы» зрушылася з мёртвай кропкі: быў аб'яўлены конкурс на мемарыяльную кампазіцыю, якая павінна была ўпісацца ў архітэктурную канцэпцыю ўсяго комплексу. Але ў конкурсе пераможца выяўлены не быў (прадстаўленыя працы не адпавядалі ўмовам конкурсу), і ў пачатку 2010 года быў абвешчаны другі тур, у якім пераможца нарэшце знайшоўся: ім стаў Канстанцін Касцючэнка са скульптурнай кампазіцыяй «Вароты памяці» (яна павінна быць выканана з бронзы вышынёй недзе каля 6 метраў).

— Праца ўяўляе сабой уваходную частку канцлагера: трохі прыадчыненыя вялікія вароты, у якіх адлюстраваны вобразы тых людзей, тых вязняў, якія знаходзіліся ў канцлагеры, — расказвае **Канстанцін КАСЦЮЧЭНКА, аўтар скульптурнай кампазіцыі.** — Целы, мышцы гэтых людзей пераплецены з дошкамі і канструкцыяй варотаў. Вонкавы бок — як старая чорна-белая фотакартка, з якой людзі глядзяць на нас з гэтых варотаў, але не могуць выйсці. Гэта сімвалізуе нашу памяць, якая заўсёды будзе з намі: ход тых падзей, якія адбываліся ў вайну, мы ўжо не зменім, але гэта павінна быць урокам на будучыню.

Што тычыцца ў цэлым праекта добраўпарадкавання тэрыторыі былога канцлагера, то пра яго нам расказала **Ганна АКСЁНАВА, навуковы кіраўнік мемарыяльнага гісторыка-культурнага комплексу «Трасцянец», галоўны архітэктар праекта УП «Мінскпраект»**:

— Нам быў дадзены заказ на першую чаргу, і мы распрацавалі праект добраўпарадкавання той часткі тэрыторыі, дзе непасрэдна размяшчаўся лагер смерці (60 гектараў у межах рэчышча ракі Трасцянкі і вуліцы Сяліцкага). Мы гэты праект выканалі, і зараз ён знаходзіцца на экспертызе: магу сказаць, што ён ужо прайшоў узгадненне ў Міністэрстве культуры і Камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама.

Як расказала Ганна Аляксееўна, у праекце прадугледжана галоўная кампазіцыйная вось — «Дарога памяці», якая будзе ісці да плошчы з помнікам «Вароты памяці». За манументам, на тым месцы, дзе калісьці фашысты рассейвалі попел спаленых людзей, будзе «Поле пахавання»: газон, адмежаваны ад вуліцы Сяліцкага пасадкай дрэў. Непасрэдна тэрыторыя канцлагера будзе абазначана мемарыяльнымі плітамі з гістарычнай інфармацыяй. Фундаменты некаторых будынкаў (баракаў, дома каменданта), якія захаваліся яшчэ з тых часоў, плануецца закансерваваць і побач з імі ўсталяваць інфармацыйныя шыльды з адпаведнай інфармацыяй. Існуючыя памятныя знакі ў «Трасцянцы» мяркуецца рэканструяваць такім чынам, каб яны ўдала спалучаліся з усёй кампазіцыяй.

Але, на жаль, рэалізаваны праект будзе не сёння, і, магчыма, нават не заўтра:

— Архітэктурны праект на добраўпарадкаванне гатовы, але яшчэ на экспертызе не быў. Мы ўключаем яго ў праект праграмы на наступны год. Але гэтую праграму яшчэ не зацвярджалі на сесіі дэпутатаў, — патлумачыла **Таццяна ЛЯЎКОВІЧ, начальнік тэхнічнага аддзела камунальнай гаспадаркі Мінгарвыканкама.**

Але гэта тычыцца толькі добраўпарадкавання тэрыторыі, а мемарыяльная кампазіцыя «Вароты памяці», якая перамагла на конкурсе, у 2012 годзе рэалізоўвацца не будзе:

— Дакументы мы падаём толькі на добраўпарадкаванне тэрыторыі, а на мемарыяльную кампазіцыю — пакуль не, — кажа Таццяна Ляўковіч.

Таццяна Васільеўна паведаміла, што добраўпарадкаванне тэрыторыі былога канцлагера «Трасцянец» ацэнена ў 9 мільярдаў 898 мільёнаў рублёў у цэнах 2006 года. Гэта недзе 30 мільярдаў рублёў у прагнозных цэнах на наступны год (ужо з улікам дэвальвацыі). А кошт мемарыяльнай кампазіцыі «Вароты памяці» нават яшчэ і не ацэньваўся.

Але ж ёсць яшчэ ўрочышча Благаўшчына, дзе немцы праводзілі масавыя расстрэлы людзей (знаходзіцца па другі бок Магілёўскай шашы), — добраўпарадкаванне гэтага месца запланавана на яшчэ больш далёкую перспектыву:

— Благаўшчына не ўвайшла ў першы этап. Але яна ўваходзіць у праект зоны аховы, і нам неабходна будзе працаваць над ёй пазней, — тлумачыць Ганна Аксёнава. — Пакуль, у сувязі з эканамічным становішчам, будзе паэтапнае асваенне: у першы пускавы комплекс увайшла толькі зона канцлагера і ўсталяванне мемарыяльнага знака. Мы хацелі ўжо і фундамент закладваць пад скульптуру, але нам сказалі, што ў сувязі з эканамічным становішчам трэба як мінімум прывесці ў парадак тэрыторыю. Бо ўсё-такі гэта тэрыторыя святая.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Да Сусветнага дня барацьбы супраць дыябету

# «Вялікіх» людзей становіцца ўсё больш

*На 7-8 працэнтаў за год прырастае колькасць хворых на цукровы дыябет у нашай краіне. У абсалютнай большасці гэта выпадкі цукровага дыябету 2 тыпу — звыш 210 тысяч чалавек. Дыябет 1 тыпу зарэгістраваны ў больш чым 15 тысяч беларусаў.*

Як вядома, тып захворвання абумоўлены рознымі механізмамі яго паходжання. Так, пры больш шырока распаўсюджаным 2-м на першы план выходзіць лад жыцця. Цукровым дыябет называецца не таму, што чалавек празмерна захапляецца салодкім. Пад цукрам у дадзеным выпадку маецца на ўвазе глюкоза, у якую ператвараецца ўсё, што мы з'ядаем, што «падскілкоўвае» нас і дазваляе арганізму функцыянаваць. З другога боку, празмернае захапленне прысмакамі, як і лішак тлушчаў у рацыёне, сведчыць аб нездаровым харчаванні, а вось яно ў сваю чаргу прыводзіць да лішняй вагі і атлусцення. Менавіта гэтая праблема і правакуе аднойчы развіццё цукровага дыябету. Лішняя вага, зразумела, цесна звязана з гіпадынаміяй. Нарэшце, яшчэ адной прычынай узнікнення дыябету з'яўляецца хранічны стрэс. Словам, гэтай праблеме спрыяе ўсё тое, што звязваюць і з іншымі сацыяльна значнымі хваробамі — сардэчна-сасудзістымі і анкалагічнымі.

Здаецца, усё на паверхні. Аднак людзей з парушэннем вугляводнага абмену становіцца ўсё больш. Дастаткова сказаць, што ва ўсім свеце тэмпы росту людзей з лішняй вагой і атлусценнем растуць яшчэ хутчэй, чым тэмпы росту хворых на цукровы дыябет. А апошнія немалыя. Паводле самых смелых прагнозаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, колькасць людзей з цукровым дыябетам у свеце павінна была прырасці за апошняе дзесяцігоддзе на 100 мільёнаў чалавек, аднак прырост аказаўся больш імклівым — 200 мільёнаў. Цяпер лічыцца, што да 2025 года праблемы вугляводнага абмену будзе мець на планеце каля 1 мільярда чалавек. А між тым спецыялісты сцвярджаюць, што людзям з парушаным вугляводным абменам дастаткова ўсяго толькі змяніць лад жыцця — і яны зноў будуць у шэрагах здаровых.

— У нас вельмі добра наладжаны скрынінг ранняга выяўлення выпадкаў захворвання на цукровы дыябет, — кажа **галоўны пазаштатны эндакрынолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Ала ШАПЯЛЬКЕВІЧ**. — Для выстаўлення дыягназу дастаткова двойчы вызначыць цукар крыві.

Сёння ўсе нашы пацыенты бясплатна атрымліваюць генна-інжынерны інсулін. Выкарыстанне свінога інсуліну завяршылася яшчэ ў мінулым годзе. З 2009 года Беларусь выпускае свой генна-інжынерны інсулін добрай якасці. Існуюць таксама аналагавыя інсуліны — гэта новыя рэвалюцыйныя тэхналогіі, якія прымяняюцца ў нас. Аналагавыя інсуліны прызначаюцца па заключэнні спецыяльнай рэспубліканскай камісіі. Па паказаннях дзецям і цяжарным прызначаюцца і інсулінавыя помпы, якія забяспечваюць бесперапынную падскурную падачу інсуліну на працягу сутак. Аднак трэба разумець, што нават такі, найбольш блізкі да фізіялагічнага, спосаб выпрацоўкі інсуліну не з'яўляецца панацэяй і не гарантуе дасягнення аптымальнага ўзроўню цукру ў крыві.

Самым важным у працы з пацыентамі, хворымі на цукровы дыябет, з'яўляецца іх навучанне — і не толькі карыстанню шпрыц-ручкай або інсулінавай помпай, але і «азам» лячэння і нават у цэлым здароваму ладу жыцця. У Беларусі на базе амбулаторных і стацыянарных устаноў функцыянуе 213 школ цукровага дыябету. Тут можна атрымаць усю неабходную інфармацыю. Кампенсацыі захворвання можна чакаць толькі пры актыўным удзеле пацыента.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Зваротная сувязь

# «Былі ў роспачы, а цяпер усім дзякуем за дапамогу»

**Пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» 8 кастрычніка ў «Звяздзе» мы пісалі пра бяду сужэнцаў Пятроўскіх з вёскі Каўгары Асіповіцкага раёна, якія не маглі знайсці адказ на пытанне: дзе можна знайсці недарагі кацёл на цвёрдым паліве? У іх доме ўстаноўлена паравое ацяпленне, і перад самай, лічы, зімой гаспадары зразумелі, што ранейшы, набыты яшчэ ў савецкія часы, кацёл пачаў працякаць. Кінуліся шукаць замену, а прапановы тыя — па цане 5-7 мільёнаў. Мала таго, што дорага, дык і не зусім падыходзяць тыя катлы...**

У мінулы раз мы ўжо адзначалі, што па ўсіх шматлікіх адрасах, куды давялося звяртацца, каб дапамагчы вяскоўцам вырашыць іх праблему, да просьбы рэдакцыі, самой бядотнай сітуацыі нашых чытачоў ставіліся выключна добразычліва, імкнуліся аператыўна знайсці патрэбныя звесткі. Дзякуючы гэтаму рэдакцыя ўжо літаральна праз некалькі гадзін магла паведаміць заяўнікам варыянты — дзе, прыкладна па якім кошце яны могуць прыдбаць такі патрэбны ім кацёл. Больш за тое, праз газету кіраўніцтва мясцовага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі папрасіла перадаць: няхай сям'я звяртаецца да іх, дапамогуць і кацёл патрэбны знайсці-прывезці, і падключыць яго.

— Гэта зваротная сувязь? Вашы колішнія заяўнікі турбуюць. Якія з месяц таму дапамогі наконт катла прасілі. Хочам падзякаваць усім — за добрыя сэрцы, за павагу, за такое стаўленне да праблем простых людзей. Мы ж у такой роспачы былі з тым катлом! А нам яго і прывезлі, і ўстанавілі. Праўда, не з Гомеля, як меркавалася напачатку, а з Мазыра. І коштам прымальным мы задаволеныя, — эмацыянальна распавяла нам гаспадыня. — Так што мы з дзедам Сашам усім вельмі ўдзячныя за дапамогу!

...Нам жа напрыканцы застаецца толькі дадаць: пішыце, тэлефануйце. Калі будзе ў нашых сілах, паспрабуем дапамагчы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падрабязнасці

# КАРЭКЦІРОЎКА РАСКЛАДУ РУХУ ЦЯГНІКОЎ ЗНОСІНАМІ З УКРАІНАЙ

**Неабходнасць карэкціроўкі выклікана рашэннем Вярхоўнай Рады Украіны 18 кастрычніка 2011 года аб пераходзе на зімовы час.**

| № цягніка, зносіны | Час прыб. на кан. пункт да 31.10.2011 | Час прыб. на кан. пункт з 01.11.2011 па 02.12.2011 | Розніца |
|---|---|---|---|
| № 85 Кіеў — Мінск | 8.35 | 9.45 | +1.10 |
| № 93 Адэса — Мінск | 12.53 | 14.21 | +1.28 |
| № 99 Сімферопаль — Мінск | 15.55 | 16.57 | +1.02 |
| № 302/301 Адлер — Мінск | 6.40 | 8.23 | +1.43 |
| № 329 Жытомір — Баранавічы | 7.52 | 9.15 | +1.23 |
| № 356/355 Кіславодск — Мінск | 6.40 | 8.23 | +1.43 |
| № 372 Львоў — Мінск | 9.05 | 10.11 | 10.11 |
| № 373 Кіеў — Гродна | 8.06 | 9.45 | +1.39 |
| № 383 Марыупаль — Мінск | 20.35 | 22.14 | +1.39 |
| № 389 Анапа — Мінск | 6.40 | 8.23 | +1.43 |
| № 394/393 Сімферопаль — Полацк | 21.40 | 23.17 | +1.37 |
| № 853 Чарнігаў — Гомель | 21.15 | 22.46 | +1.31 |
| № 855 Шчорс — Гомель | 21.04 | 22.24 | +1.20 |

Для карэкціроўкі раскладу міжнародных пасажырскіх цягнікоў часова прыпынены продаж білетаў з 03.12.2011 на цягнікі ў зносінах з Украінай, а таксама на транзітныя цягнікі, якія рухаюцца па тэрыторыі Беларусі ў зносінах з Украінай.

**ТРАНЗІТНЫЯ ЦЯГНІКІ:**

№ 19/20 Адэса — С.-Пецярбург,
№ 48/47 Львоў — С.-Пецярбург,
№ 54/53 Кіеў — С.-Пецярбург,
№ 62/61 Кішынёў — С.-Пецярбург,
№ 311/312 Харкаў — Калінінград,
№ 323/324 Харкаў — Мурманск,
№ 336/335 Днепрапятроўск — С.-Пецярбург,
№ 348/347 Марыупаль — С.-Пецярбург

***рухаюцца з магчымым спазненнем да адной гадзіны.***

кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 44 (706)
аддзел рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ЗВЯЗДА

## КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя________ №_______________ Выдадзены ______________

Подпіс ______________________ Дата ___________

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❒ А/м «Форд-Эскорт», 1994 г.в., хэтчбэк, за бел. рублі, танна.
Тэл.: МТС 764 42 91, Вел 363 40 95.

❒ А/м «ВАЗ-2101» 1977 г.в., чырвоны, танна.
Тэл. 8 017 296 40 28, МТС 756 60 54.

❒ Рухавік ад а/м «Пежо-406», 2002 г.в., 2,2 бензін.
Тэл. 8 029 585 37 00.

❒ Дом у в. Браносава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобл., з г/п, 20 сотак, калодзеж, ёсць газ, сад, гараж. Танна.
Тэл. 8 01772 533 34.

***РОЗНАЕ***

❒ Выконваем усе ўнутраныя будаўнічыя работы. УНП 600374363.
Тэл. Вел 984 63 69.

У **суд Бабруйскага раёна** і **г. Бабруйска** паступіла заява аб прызнанні памерлым **Садзікава Бахадзіржона Мамазакіравіча,** 24.08.1955 года нараджэння, ураджэнца г. Андзіжанска Андзіжанскай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства: Рэспубліка Беларусь, Магілёўская вобл., г. Бабруйск, вул. Тухачэўскага, д. 1, кв. 28, месца знаходжання невядома.

Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Садзікава Б.М., паведаміць іх суду Бабруйскага раёна і г. Бабруйска Магілёўскай вобл. на адрас: г. Бабруйск, вул. Кастрычніцкая, 128, каб. 46, тэл. 52 11 26 на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ**

Аукционы состоятся **16 декабря 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Организатор аукционов – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Размер задатка, подлежащего внесению для участия в аукционе | Время проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | | |
| 1. | Открытое акционерное общество «Завод сборного железобетона № 3 г. Витебска» (ОАО «СЖБ № 3 г. Витебска») 210604, Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, дом 1 | 9 195 325 | 150 | 9 171 438 | 99,7 | 9 171 438 | 99,7 | 18 150 000 000 | 1 815 000 000 | 9.40 |
| 2. | Открытое акционерное общество «Минскпроектмебель» (ОАО «Минскпроектмебель») 220073, г. Минск, ул. Кальварийская, дом 33 | 32 857 132 | 140 | 32 777 244 | 99,8 | 32 777 244 | 99,8 | 115 400 000 000 | 11 540 000 000 | 10.00 |
| 3. | Открытое акционерное общество «МИСОМ ОП» (ОАО «МИСОМ ОП») 220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, дом 27, корп. 1 | 212 607 | 5500 | 148 660 | 69,9 | 148 660 | 69,9 | 16 400 000 000 | 1 640 000 000 | 10.20 |
| 4. | Открытое акционерное общество «Реммех» (ОАО «Реммех») 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, д.48 | 6 254 080 | 150 | 6 245 192 | 99,9 | 6 245 192 | 99,9 | 27 470 000 000 | 2 747 000 000 | 10.40 |
| 5. | Открытое акционерное общество «Молодечнолес» (ОАО «Молодечнолес») 222410, Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. 1-го Мая, дом 106 | 28 291 129 | 120 | 28 245 477 | 99,8 | 28 245 477 | 99,8 | 3 380 000 000 | 338 000 000 | 11.00 |
| 6. | Открытое акционерное общество «Гомельский комбинат строительных конструкций» (ОАО «ГКСК») 246028, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, дом 303А | 6 197 690 | 3300 | 6 197 690 | 100 | 6 197 690 | 100 | 34 400 000 000 | 3 440 000 000 | 11.20 |
